УДК 821.161.3-3.09 DOI 10.52928/2070-1608-2023-68-3-80-84

# НАВЕЛІСТЫЧНАЯ МІНІЯЦЮРА Ў ТВОРЧАСЦІ У. СЦЯПАНА (НА МАТЭРЫЯЛЕ ЦЫКЛА “САЛДАЦКІ ГУЗІК”)

*канд. філал. навук **М.М. ВОІНАВА-СТРАХА***
*(Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт)*
***ORCID: https://orcid.org/0009-0008-9133-9750***

*Артыкул прысвечаны вызначэнню жанравых асаблівасцей навелістычнай мініяцюры ў творчасці сучаснага беларускага пісьменніка Уладзіміра Сцяпана (на матэрыяле цыкла “Салдацкі гузік”, зборнік “Хвалі”, 2019 г.). Выяўлены агульныя і адметныя рысы навелістычнай мініяцюры: цыклічнасць, адзінства агульнага праблемна-тэматычнага поля, лаканічнасць, мінімалісцкі аб'ём, навелістычная парадаксальнасць, кантрастнасць, засяроджанасць на яркім незвычайным моманце, дынамічнасць і нечаканы паварот сюжэтнай лініі. Спецыфікай навелістычных мініяцюр цыкла «Салдацкі гузік» У. Сцяпана з’яўляецца наяўнасць экзістэнцыйных матываў, сімвалізму, увага да дэталяў.*

**Ключавыя словы:** *навела, мініяцюра, малая проза, У. Сцяпан, жанр, мадыфікацыя, беларуская літаратура.*

**Уводзіны**. Адной з вядучых адзнак развіцця жанравай сістэмы сучаснага беларускага прыгожага пісьменства з’яўляецца зварот да малых форм: навела, апавяданне, мініяцюра і інш. Дадзеная акалічнасць невыпадковая: хуткаплынны рытм жыцця ў прасторы XXI стагоддзя вымушае аўтараў знаходзіць аптымальныя спосабы і сродкі аператыўнага водгуку на зменлівае аблічча сучаснага свету ў цэлым і асобнага чалавека ў прыватнасці.

Так, празаічная мініяцюра даўно заняла трывалае месца ў нацыянальнай мастацкай прасторы. Пытанням станаўлення і развіцця гэтага адметнага жанру прысвечаны шэраг навуковых прац айчыннага літаратуразнаўцы Р.К. Казлоўскага, які вызначыў не толькі спецыфіку функцыянавання мініяцюры ў творчасці такіх аўтарытэтных пісьменнікаў, як З. Бядуля, М. Гарэцкі, Я. Брыль, Б. Сачанка, Ф. Янкоўскі і інш., але і выявіў адметнасці яе “пераходных форм” – мініяцюра і апавяданне, мініяцюра і абразок[1]. Аналіз развіцця айчыннага літаратурнага працэсу сведчыць аб тым, што ўвагі заслугоўваюць не толькі ўзаемадзеянне мініяцюры з вышэйзгаданымі жанрамі, але і з навелай, суіснаванне з якой у тэкставай прасторы вылучаецца даволі прадуктыўным характарам. Перакрыжаванне мініяцюры і навелы перыядычна апыналася ў фокусе ўвагі навукоўцаў з пункту гледжання выяўлення некаторых адметнасцей яго рэалізацыі ў творчай прасторы асобных пісьменнікаў (праблемна-тэматычны, сюжэтна-кампазіцыйны, стылёвы аспекты) [1]. Аднак на дадзены момант у беларускім літаратуразнаўстве адсутнічае асобнае грунтоўнае даследаванне, у якім былі б вызначаны асаблівасці функцыянавання акрэсленай мадыфікаванай формы ў сучасным айчынным прыгожым пісьменстве. Аналіз мастацкай рэалізацыі навелістычнай мініяцюры ў творчасці сучаснага беларускага пісьменніка У. Сцяпана дазволіць выявіць адметнасці яе развіцця ў кантэксце актуальных тэндэнцый айчыннай малой прозы XXI ст. Для дасягнення вышэйакрэсленай мэты звернемся спачатку да вызначэння асаблівасцей мініяцюры і навелы як самастойных жанраў.

**Асноўная частка.** Рускія літаратуразнаўцы А. Полева [2], В. Баймiева [3] акцэнтуюць увагу на адсутнасці строга вызначаных параметраў жанравай формулы мініяцюры. Разам з тым, пэўная “размытасць” межаў не перашкаджае вылучыць спецыфічныя прыкметы, якія дазваляюць сцвярджаць самастойнасць разглядаемага жанру.

Лічыцца, што жанр мініяцюры запазычаны ў літаратуразнаўстве з жывапісу, дзе абазначае выкананы фарбамі невялікіх памераў малюнак, кніжную застаўку, канцоўку і г.д. Паходжанне тэрміна даследчыкі звязваюць са словам “мініум” – назва чырвонай фарбы (кінавар ці сурык), якая ўжывалася старадаўнімі майстрамі мініяцюры[2]. Аналізуючы гісторыю развіцця мініяцюры, даследчык Ю. Арліцкі знаходзіць аналагі празаічных мініяцюр у творчай спадчыне рускіх майстроў слова XIX стагоддзя: К. Бацюшкава, В. Жукоўскага, В. Цеплякова, А. Сомава. Разглядаючы станаўленне дадзенага жанру ў рускай літаратуры, навукоўца выказвае думку аб магчымасці выдзялення падтыпаў у залежнасці ад перавагі той ці іншай структурна-жанравай традыцыі. У аснову такога размежавання закладваецца функцыя фабулы: бесфабульныя, чыста лірычныя вершы ў прозе Ю. Арліцкі прапаноўвае назваць “лірычнымі мініяцюрамі” [4], фабульныя – кароткмі апавяданнямі. Асобна вылучаюцца міні-эсэ, якія ўзыходзяць каранямі ў дзённікавыя нататкі. А. Палевай акрэсліваецца адметная роля празаічнай мініяцюры ў дзіцячай літаратуры. Аўтарам разглядаецца шлях станаўлення і развіцця мініяцюр-казак і іх разнавіднасцей у рускім прыгожым пісьменстве XIX – XXI стагоддзяў [2].

Некаторыя навукоўцы ўказваюць на важнасць захавання паміж складнікамі мініяцюры тых жа прапорцый, што і ў творы вялікага памеру. Так, у Слоўніку літаратурных тэрмінаў акрэсліваецца, што “мініяцюрай можа быць названы твор, які ахоплівае па аб’ёме сваіх вобразаў ці ідэй такую ж шырокую вобласць, што і буйны літаратурны твор, а не абмяжоўваецца адным якім-небудзь момантам, выхапленым з жыцця, па-за яго агульнажыццёвым сэнсам[2].

[1] Казлоўскі Р.К. Беларуская празаічная мініяцюра XX стагоддзя: аўтарэф. дыс. ... канд. філал. навук: 10.01.01; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2002. – 22 с.
[2] Дынник В. Миниатюра [Электронный ресурс]. – URL: https://feb-web.ru/feb/slt/abc/lt1/lt1-4434.htm.

Айчынны літаратуразнаўца Р. Казлоўскі акцэнтуе ўвагу на такіх складніках празаічнай мініяцюры, як “невялікі аб’ём, свабодная кампазіцыя, бессюжэтнасць, суб’ектыўнасць, выразнасць мастацка-выяўленчых сродкаў пры моцнай насычанасці ідэйна-філасофскім зместам, а таксама спалучэнне асаблівасцей эсэістычнага стылю. Паводле сэнсавых уласцівасцей мініяцюра ў сваім змесце ўтрымлівае імгненны фрагмент (малюнак) рэчаіснасці, думкі”[1]. Згодна з В. Рагойшам, спецыфічнай адзнакай мініяцюры з’яўляецца не толькі невялікі аб’ём, але і абавязковая завершанасць па форме і думцы [5, с. 111].

Асаблівая роля ў жанры мініяцюры надаецца цыклічнасці, якая прадугледжвае адмысловую ўзаемасувязь паміж тэкстамі, аб’яднанымі адзінствам тэмы, ідэі, вобразнай сістэмай, сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі, адзіным загалоўкам і лагічным завяршэннем. Так званыя цыклаўтваральныя сувязі не выключаюць, аднак, магчымасці ўзнаўлення мініяцюры як самастойнай тэкставай адзінкі. Літаратуразнаўца В. Байміева акрэслівае прамую залежнасць паміж адрознасцю форм выражэння аўтарскай свядомасці і прасторава-часавымі каардынатамі. Як слушна акрэслівае даследчыца, “у мініяцюрах жыццё можа паўстаць як імгненне, імгненне як інтэнсіўны згустак і імгненне як імгненне, якое доўжыцца, імгненне трагічнае, таму што чалавечае жыццё мае свой канец. Пры гэтым аўтары могуць пашыраць імгненне да вечнасці” [3]. Сярод адметных рыс жанравай прыроды мініяцюры вылучаюцца невялікі аб’ём, кампазіцыйная завершанасць, неад’емным складнікам якой даследчыкі лічаць “перавагу аднаго кампазіцыйнага элемента – кульмінацыі, узмоцненай аўтарскай экспрэсіяй і дамінуючым вобразам аўтара, які зліваецца часцей за ўсё з апавядальнікам” [3].

Гэтымі рысамі празаічная мініяцюра набліжаецца да навелы, сярод асноўных прынцыпаў паэтыкі якой вылучаюцца лаканізм, дынамізм, кантрастнасць, парадаксальнасць, “пуэнтычнасць” (востры, рэзкі, нечаканы паварот), прасторава-часавая лакалізацыя, сфакусаванасць на адзінай незвычайнай падзеі. Дадзены жанр у беларускай літаратуры сфарміраваўся на аснове класічнай навелы пад уздзеяннем нацыянальных фактараў развіцця мастацтва слова: узрастала на грунце народных забаўляльных апавяданняў, гісторый, анекдотаў, легенд, паданняў, міфаў, казак, увабрала здабыткі розных мастацка-эстэтычных эпох і стыляў, пачынаючы ад Рэнесансу і да Постмадэрнізму. Захоўваючы класічныя прынцыпы арганізацыі навелістычнага тэксту (лаканізм, дынамізм, кантраснасць, парадаксальнасць, “пуэнтычнасць” (востры, рэзкі, нечаканы паварот), прасторава-часавая лакалізацыя, сфакусаванасць на адзінай незвычайнай падзеі), беларуская навела набыла шэраг спецыфічных прыкмет: імкненне да эпічнай шырыні, фрагментарнасць арганізацыі наратыўнай прасторы, мазаічнасць і незавершанасць карціны, сінкрэтызм, філасафічнасць, псіхалагічнасць, ускладненасць кампазіцыі і пуэнтычнай развязкі[3].

Варта адзначыць, што ў замежным літаратуразнаўстве тэрмін “мініяцюра” неназіраецца ў шырокім навуковым ужытку. У шэрагу англамоўных слоўнікаў літаратурных тэрмінаў[4] дадзенае паняцце альбо ўвогуле не прадстаўлена, альбо згадваецца ў значэнні “маленькага рознакаляровага малюнка ў рукапісу, невялікага завершанага партрэта ці выявы, прадстаўленай у невялікім маштабе”[5]. Не знайшло ў замежным літаратуразнаўстве сталага замацавання і паняцце навелістычнай мініяцюры, што, з нашага пункту гледжання, прадвызначае шырокую перспектыву падобных даследаванняў, у тым ліку ў кампаратыўным аспекце, у далейшым.

Разам з тым, аналіз асаблівасцей навелы і мініяцюры дазваляе прыйсці да высновы, што іх узаемадзеянне – натуральны вынік жанравай эвалюцыі. Як сведчыць даследаванне творчасці Уладзіміра. Сцяпана, такі сінтэз надзвычай прадуктыўны з пункту гледжання рэалізацыі жанравых магчымасцей, бо стварае для пісьменнікаў плённую глебу для імгненнага занатавання ў мастацкай прасторы зрухаў у светапоглядной сістэме грамадства ў цэлым і асобы ў прыватнасці з улікам хуткаплынных павеваў часу. Перакрыжаванне элементаў навелы і мініяцюры дазваляе выявіць такое мадыфікацыйнае ўтварэнне, як навелістычную мініяцюру. У прадстаўленым артыкуле скіруем увагу на вызначэнне жанравых адметнасцей дадзенай формы ў творчасці сучаснага беларускага пісьменніка Сцяпана з улікам індывідуальна-аўтарскага ўвасаблення навелістычнай мініяцюры ў яго мастацкай прасторы. У якасці аб’екту аналізу абраны цыкл навелістычных мініяцюр “Салдацкі гузік” (зборнік “Хвалі”, 2019 г.).

Уладзімір Сцяпан (нар. у 1958 г.) вядомы як майстар кароткага жанру. Яго пяру належаць зборнікі “Вежа” (1990), “Сам-насам” (1990), “Адна капейка” (2012), кнігі “Настаўнік. Сяргей Пятровіч Каткоў” (2013), “Папяровая шапка” (2018), “Хвалі” (2019). Адметнасцю яго індывідуальна-творчага стылю з’яўляецца “выяўленчасць” пісьма, “калі маляванне (як працэс і мэта адначасова) становіцца сюжэтным грунтам (“Мінскі альбом”) альбо аб’ектам мастацкай інтэрпрэтацыі” [1], што цалкам выглядае лагічным з улікам яго прафесійнага вопыту, набытага падчас вучобы ў мастацкім вучылішчы. Навелістычныя мініяцюры з цыкла “Салдацкі гузік” У. Сцяпана ўтрымліваюць элементы абодвух жанраў, якія праяўляюцца ў рознай ступені інтэнсіўнасці, аднак з’яўляюцца дастаткова акрэсленымі для вызначэння дадзенай міжжанравай формы.

Так, творы з акрэсленага цыкла аб’яднаны адзінай скразной тэмай і сістэмай вобразаў. “Салдацкі гузік” складаецца з шэрагу “замалёвак” з салдацкага жыцця, празаічных мініяцюр, значная частка якіх – навелістычныя

[3] Воінава-Страха М.М. Навела ў беларускай літаратурнай традыцыі: генезіс, эвалюцыя, тэндэнцыі развіцця : аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук : 10.01.01; НАН Беларусі, Ін-т мовы і літ. ім. Я. Коласа і Я. Купалы. – Мінск, 2011. – 26 с.

[4] Cuddon J. A. A dictionary of literary terms and literary theory. – 5th ed. – Oxford: Wiley-Blackwell, 2013. – 784 p.; Baldick C. The Oxford Dictionary of Literary Terms. – 4th ed. – Oxford: Oxford Univ. Press, 2015 – 448 p.; Childs P., Fowler R. The Routledge Dictionary of Literary Terms. – London: Routledge, 2006 – 254 p.; Quinn E. A dictionary of literary and thematic terms. – 2nd ed. – New York: Checkmark Books, 2006. – 474 p.

[5] Scott A. F. Current literary terms. A concise dictionary of their Origin and Use. – Cambridge: Cambridge Univ. Press, 1979. – 324 p.

па сваім характары. Тэксты ў прамым сэнсе слова мінімалістычныя па аб'ёме: ад двух – трох абзацаў ("Вока", "Кісель", "Каранцін") да паўтары старонкі ("Гашак", "Цыгарэта", "Белавежская", "Таіці", "Кухар", "Рэмарк", "Гузік"). У цэнтры аўтарскіх навелістычных мініяцюр – выпадак, які вылучаецца на фоне шараговай паўсядзённасці сваёй незвычайнасцю, неардынарнасцю, "навізной", здольнай зачапіць увагу чытача адным штрыхом, трапнай дэталлю, адмыслова акрэсленым акцэнтам. Наратыўная прастора мініяцюры не прызначана для маштабнага разгортвання падзеі і падрабязна выбудаванай псіхалагічнай характарыстыкі персанажаў. З аднаго боку, здаецца, што пісьменнік абмежаваны ў мастацкіх рэсурсах для стварэння "паўнавартаснай" карціны. Аднак У. Сцяпан – навеліст, надзелены асаблівым талентам. Ён здольны ўздзейнічаць на чытача, уздымаючы на паверхню цэлую гаму нечаканых эмоцый.

Так, навелістычная мініяцюра "Вока" вылучаецца лаканічнасцю структуры, аднак, такога сціслага фармату дастаткова, каб перадаць і драматызм, і камізм сітуацыі адначасова. Пісьменнік, не маючы магчымасці дэталізацыі сюжэтнай карціны з прычыны спецыфікі жанру, тэзісна перадае змест дзеяння, факусуючы ўвагу чытача на ключавых аспектах падзеі ў парадку пераліку. Пры гэтым, аднак, захоўваюцца дамінуючыя складнікі навелістычнага жанру: кантрастнасць, парадаксальнасць, нечаканы паварот. Уступная частка тэксту пабудавана па прынцыпе градацыі з мэтай узмацнення эфекту ўражання ад далейшага павароту дзеяння: "У першы дзень службы Толік Бохан змог напісаць адзін ліст. У другі – два. На трэці ліст напісаў, але не было капэрты, каб даслаць. За чацвёрты тыдзень ён напісаў яшчэ два лісты і пазычыў тры капэрты ў земляка" [6, с. 104]. Навелістычны кантраст прадстаўлены на ўзроўні характарыстыкі псіха-эмацыянальнага стану персанажаў ("казарма рагатала" – "Толік заплакаў" [6, с. 104], весялосць салдат – раз'юшанасць Толіка) і іх экзістэнцыйных мадэлей. Сістэмы маральных каардынат такіх прадстаўнікоў грамадства, як Толік, і такіх, як сяржант і Валя Гурок, цалкам антытэтычныя. З гэтай прычыны і парадаксальнасць бачыцца нам як на павярхоўным падзейным, так і на сутнасным унутраным узроўнях: Толік выбіў вока сяржанту, але завяршыў службу не з сорамам, а з гонарам, атрымаўшы медаль "За адвагу на пажары". Відавочна, што гаворка ідзе пра розныя па змесце і часе ўчынкі, але лічым невыпадковым характар расстаўленых акцэнтаў: Толік – чалавек, надзвычай чуллівы да заганных праяў акаляючага свету, такіх як абраза чалавечай годнасці і несправядлівасць. Акрамя таго, яму ўласціва ўсведамленне важнасці жыцця асобы. Ён гатовы адстойваць свае каштоўнасныя прыярытэты любой цаной. У акрэсленым кантэксце загаловак твора "Вока" набывае дадатковае сімвалічнае адценне.

Адной з неад'емных адзнак навелістычнага жанру з'яўляецца ўтрымліванне загадкавага элемента, на раскрыццё якога накіраваны сюжэт твора. У аналізуемым цыкле аўтарам выкарыстаны такі прадуктыўны з пункту гледжання дасягнення вышэйакрэсленай мэты прыём, як сімвалізм загалоўка. Прапанаваныя пісьменнікам загалоўкі – "Фрэнсіс Скот Фіцджэральд", "Вока", "Цыгарэта", "Белавежская", "Таіці" – двухузроўневыя па закладзеным у іх сэнсе. З аднаго боку, яны нагадваюць верхавіну айсберга, якая толькі адцягвае ўвагу ад сутнасці і ўводзіць чытача ў зман, з іншага ж, змяшчае ў сабе ключ да разгадкі, стаць уладальнікам якога магчыма толькі праз паглыбленне ў кантэкстуальны пласт схаваных значэнняў.

Так, у навелістычнай мініяцюры "Таіці" створаны "каларытны" малюнак – толькі фон для разгортвання па-сапраўднаму экзістэнцыяльнай сітуацыі. Герой твора атрымаў загад стварыць у доўгім пакоі фотастудыі вальеру для маленькіх папугайчыкаў, продажам якіх займаўся начальнік клуба. Догляд птушак быў давераны сталяру Ігару Січкару, які добрасумленна выконваў свае абавязкі, тым больш што за гэта яму быў абяцаны дадатковы бонус: начальнік клуба, нягледзячы на непрацяглы тэрмін службы, паабяцаў адпусціць яго на цэлыя тры дні і дзве ночы для сустрэчы з жонкай. Для ўзмацнення навелістычнага кантрасту пісьменнік плённа выкарыстоўвае дэталі рэчыўнага свету і характарыстыкі персанажаў. Так, пісьменнік быццам зусім нязмушана згадвае пра тое, што салдата перавялі ў клуб з прычыны моцнага заікання. Гэты, здавалася б, дробны штрых стварае сітуацыю нявольнага суперажывання герою, а намаляваныя на вялікім задніку рукой мастака "пальмы, лісце дробнае і вялікае, кветкі, ліяны, дзівосныя расліны, блакітнае неба, мора" [6, с. 113] надаюць больш выразны акцэнт агульнай панараме, на фоне якой будзе разгортвацца далейшае трагічнае дзеянне: "У фотастудыі было цёпла і ціха. Пад намаляванымі ярка-зялёнымі пальмамі, бананамі, ліянамі, кветкамі і рознымі іншымі раслінамі ляжалі, як ападкі, стракатыя пташкі" [6, с. 114]. Ігар Січкар, эмацыянальна спустошаны з прычыны няздзейсненых чаканняў сустрэчы з жонкай, бо спажывецкія памкненні прапаршчыка да атрымання матэрыяльнай выгады аказаліся мацнейшымі за пачуццё чалавечай спагады і ўменне трымаць дадзенае слова, стварыў умовы для гібелі маленькіх птушак. Уладзімір Сцяпан не дае прамой ці ўскоснай ацэнкі ўчынку ні Ігара Січкара, ні іншых герояў. Пісьменнік, падобна мастаку, стварае кантрасную мазаіку, вядучая роля ў якой належыць штрыху, імгненню, фрагменту, адмыслова выхапленаму з жыцця, пакідаючы чытачу прастору для шматбаковай рэфлексіі.

Уладзімір Сцяпан у цыкле празаічных мініяцюр "Салдацкі гузік" праявіў сябе як выключны майстар дэталі. Пісьменнік факусуе ўвагу на, здавалася б, другасных аб'ектах рэчаіснасці: цыгарэту ("Рэмарк"), ножык ("Кухар"), птушак ("Таіці"), пляшку гарэлкі ("Белавежская"), кнігу ("Фрэнсіс Скот Фіцджэральд", "Томас Ман", "Флабер"), кавалак сала ("Сала"), гузік ("Гузік"). Аднак за гэтымі дэталямі хаваецца цэлы свет чалавечых лёсаў, раскрываецца сістэма духоўна-маральных арыенціраў і філасофскіх поглядаў самога аўтара і сучаснага яму грамадства ў цэлым.

Так, у цэнтры навелістычнай мініяцюры "Гузік" кранальныя моманты сустрэчы салдата з жонкай, якія замест доўгачаканых гадзін вымушаны правесці разам усяго некалькі хвілін у сувязі з пераводам брыгады на

ўзмоцнены рэжым. Тэкст пабудаваны на кантрастных замалёўках псіха-эмацыянальнага стану героя, перададзеных прама: "Жонка прамаўляла ўсхвалявана і радасна, я ж рабіўся ўсё болей і болей змрочны, амаль пачарнеў, а рука калацілася…" [6, с. 125] і апасродкавана: перашытыя героем сумленна гузікі шыняля ў пачатку аповеду, да сустрэчы з жонкай, і адарваны гузік у канцы: "Я ішоў ад КПП у клуб. Ішоў і круціў гузік на сваім шынялі. Калі дайшоў да пляца, то бліскучы гузік з зоркай быў у мяне ў кулаку, а з шыняля, як джала, тырчалі чорныя ніткі" [6, с. 126]. Адарваны гузік апавядальнік захаваў на ўсё жыццё як сімвал памяці пра яркія імгненні свайго мінулага. Адметнасцю сюжэтна-кампазіцыйнай арганізацыі дадзенага тэксту з'яўляецца наяўнасць беглай рэтраспекцыі (кароткі аповед жонкі пра непрыемнае здарэнне па дарозе на спатканне), а таксама імклівы паварот дзеяння, выкліканы нечаканым з'яўленнем прусака на падваконні. Здавалася б, такая дробная дэталь, якую ў маштабах вялікага тэксту можна было б пакінуць незаўважнай, аднак, у рамках мініяцюры любы, нават самы другасны, на першы погляд, аспект здольны напаўняцца сэнсам.

Аналіз многіх тэкстаў з цыклу "Салдацкі гузік" сведчыць аб надзеленасці рэчыўнага свету У. Сцяпана адмысловай красамоўнай глыбінёй. Дэталі ў мастацкай прасторы аўтара набываюць значэнне сімвалаў памяці, якія клапатліва аберагае герой-апавядальнік. Ён з цеплынёй згадвае "кніжку Фрэнсіса Скота Фіцджэральда" [6, с. 107] ("Фрэнсіс Скот Фіцджэральд"), з нажыкам, падараваным у знак глыбокай удзячнасці ("Кухар"), "прахадзіў гадоў дваццаць пяць", а гузік з зоркай з аднайменнай мініяцюры прывёз дадому і клапатліва аберагаў на працягу ўсяго жыцця: "Ён і сёння ёсць, недзе ў скрынях, у шафе з рознымі паперамі і дробнымі, збольшага непатрэбнымі рэчамі. Ляжыць учарнелы, пазелянелы… " [6, с. 126]. Дэталі рэчыўнага свету дапаўняюць мастацкую карціну сэнсамі, пачуццямі, прыадкрываючы чытачу тое, што з прычыны спецыфікі мінімалістычнага фармату жанру застаецца "за кадрам", але без чаго прастора тэксту аказваецца няпоўнай.

Нягледзячы на пэўную сфакусаванасць аўтара на розных эпізодах і імгненнях салдацкага жыцця навелістычныя мініяцюры з цыкла "Салдацкі гузік" вылучаюцца цэльнасцю створанай аўтарам мастацкай карціны свету. Прадстаўленыя тэксты аб'яднаны не толькі сістэмай вобразаў і тэмай салдацкага жыцця. З дробных перыпетый будзённага побыту салдат фарміруецца пярэстая карціна экзістэнцыйных мадэлей чалавечага жыцця, мінімалістычная толькі па форме, па змесце ж – глыбока скіраваная ў самую сутнасць асобаснага быцця.

**Заключэнне**. Такім чынам, выразная наяўнасць прыкмет, уласцівых жанрам навелы і мініяцюры, дазваляе вызначыць жанравую прыроду твораў з цыкла "Салдацкі гузік" У. Сцяпана як навелістычныя мініяцюры. Цыклічныя, паяднаныя агульным праблемна-тэматычным полем, дадзеныя творы адрозніваюцца лаканічнасцю і мінімалістычным аб'ёмам. Ім уласцівы навелістычная парадаксальнасць, кантрастнасць, сфакусаванасць на яркім, незвычайным моманце, дынамічнасць і нечаканы паварот сюжэтнай лініі. Спецыфікай навелістычных мініяцюр дадзенага цыкла У. Сцяпана з'яўляецца наяўнасць экзістэнцыяльных матываў, сімвалізм рэчыўнага свету, адметная выразнасць, маляўнічасць і вобразнасць мастацкай дэталі.

ЛІТАРАТУРА

1. Шаўлякова І. Капаэйра ў сутонні // Дзеяслоў. – 2013. – № 2 (63). – С. 327–332. – Рэц. на кн.: Сцяпан, У. Адна капейка / У. Сцяпан. – Мінск : ЛіМ, 2012. – 224 с.
2. Полева Е.А. Художественное своеобразие прозаических миниатюр-сказок Татьяны Мейко [Электронный ресурс]. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/hudozhestvennoe-svoeobrazie-prozaicheskih-miniatyur-skazok-tatyany-meyko. (дата обращения: 22.03.2023).
3. Баймиева В.Ю. Жанр миниатюры в русской литературе XX века [Электронный ресурс]. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/zhanr-miniatyury-v-russkoy-literature-hh-veka. (дата обращения: 22.03.2023).
4. Орлицкий Ю. Большие претензии малого жанра: (по итогам первого Тургеневского фестиваля малой прозы) [Электронный ресурс]. – URL: https://magazines.gorky.media/nlo/1999/4/bolshie-pretenzii-malogo-zhanra.html. (дата обращения: 10.02.2023).
5. Рагойша В.П. Літаратуразнаўчы слоўнік: тэрміны і паняцці. – Мінск: Нар. асвета, 2009. – 303 с.
6. Сцяпан У. Хвалі: аповесці і апавяданні. – Мінск: Маст. літ., 219. – 278 с.

*Паступіў 04.04.2023*

## НОВЕЛЛИСТИЧЕСКАЯ МИНИАТЮРА В ТВОРЧЕСТВЕ В. СТЕПАНА (НА МАТЕРИАЛЕ ЦИКЛА "СОЛДАЦКАЯ ПУГОВИЦА")

***канд. филол. наук М.М. ВОИНОВА-СТРЕХА***
***(Минский государственный лингвистический университет)***

*Статья посвящена определению жанровых особенностей новеллистической миниатюры в творчестве современного белорусского писателя Владимира Степана (на материале цикла «Солдатская пуговица», сборник «Волны», 2019 г.). Выявлены общие и отличительные черты новеллистической миниатюры: цикличность, единство общего проблемно-тематического поля, лаконичность, минималистский объем, новеллистическая пара-*

*доксальность, контрастность, сосредоточенность на ярком, необычном моменте, динамичность и неожиданный поворот сюжетной линии. Спецификой новеллистических миниатюр цикла «Солдатская пуговица» В. Степана является наличие экзистенциальных мотивов, символизма, внимание к деталям.*

***Ключевые слова:*** *новелла, миниатюра, малая проза, В. Степан, жанр, модификация, белорусская литература.*

## NOVELLA-MINIATURE IN THE WORKS OF V. STEPAN (BASED ON THE TEXTS OF THE CYCLE "SOLDIER'S BUTTON")

***M. VOINOVA-STREKHA***
***(Minsk State Linguistic University)***

*The article is devoted to the revealing of the genre features of the novella-miniature in the works of the contemporary Belarusian writer Uladzimir Stepan (based on the texts of the cycle "Soldier's Button", collection "Waves", 2019). The general and distinctive features of the novella-miniature are revealed: cyclicality, unity by a common problem-thematic field, brevity, minimalist volume, novelistic paradox, contrast, focus on a bright, unusual moment, dynamism and an unexpected turn of the storyline. The specificity of the novella-miniature of the cycle "Soldier's Button" by U. Stepan is the presence of existential motifs, symbolism, and attention to a detail.*

***Keywords:*** *novella, miniature, short prose, V. Stepan, genre, modification, Belarusian literature*